Opłata pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

# ЖЫЦЬЦЁ БЕЛАРУСА

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 — 6. (Wilenska 12. m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзен. Адміністр. ад 9 да 3

Падпіска на адзін месяц з дастаукай да хаты 2 зл. Для заграніцы удвая даражэй.

**Перамена адрэса 30 грошы.**

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп.

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

№. 15. Вільня, Серада, 28-га кастрычніка 1925 г. Год I.

**ЧАРОДНАЯ КАНФІСКАЦЫЯ. Камісар Ураду на м. Вільню, п. Вімбор, сканфіскаваў № 14 „Жыцьця Беларуса“ з 24 кастр. с. г. за артыкулы: „Новы замах на Базыльянскія муры“, „Хто мы такія“ Трылісьцьніка і заметку ў хроніцы: „Прысуд сьмерці апошняй беларускай школе“.**

## Бярэце, што вашае!

„Языковыя законы“, якіх, на жаль, польскі ўрад дагэтуль не праводзе ў жыцьцё, зьяўляюцца запраўды нейкім *сталым плебісцытам.* Паскольку беларусы хочуць мець свае нацыянальныя школы, ці прынамся даказаць усяму сьвету сваё права на гэта, яны не павінны супакоіцца на тым, што вясной сёлета падавалі дэкларацыі. Гэткіх дэкларацыяў, як ведама, пададзена толькі на 400 беларускіх школ. Але—гэта толькі *малая частка таго, што нам патрэбна і на што мы маем права.* І мы *кожную восень* — да першага студзеня будучага году—*мусім павялічываць лічбу дэкларацыяў*, мусім пашыраць усё болей і болей сьвядомасьць нашага народу.

Урад братоў Грабскіх дужа добра ведае, што ён робе, прыпыняючы самавольна дзейнасьць „языковых законаў“, якія *ўжо ў гэту восень павінны былі нам даць 400 беларускіх урадавых школ.* Тое, што гэтыя школы, ня гледзячы на ясны загад законаў, урадам не адчынены, што не адчынена хоць-бы дзеля прызваітасьці нават ані адна такая школа, — гэта выразна разьлічана на тое, каб *забіць у нашым народзе веру* ў магчымасьць мець нейкую карысьць з сваіх правоў, дадзеных „языковымі законамі“, і *адбіць у яго ахвоту* да падаваньня далейшых дэкларацыяў....

Да гэтае мэты выразна вядуць і тыя рэпрэсіі—вобыскі і арышты, якія былі скіраваны за апошнія часы перад усім проці тых, хто чынна дапамагаў сялянам арганізаваць падачу школьных дэкларацыяў.

Калі-б гэткая палітыка дапяла сваей мэты, калі-б, запужаныя рознымі незаконнымі „штучкамі“ з боку заінтэрэсаваных асоб, нашы сяляне перасталі зусім дабівацца роднае школы, дык з гэтага ўраз-жа быў-бы зроблены вывад, што беларусы *„зусім здаволены“* чужой ім па мове польскай школай—з аднаго боку, дый што *беларусаў у Польшчы наагул няма*—з другога! І перад усім сьветам польскі ўрад меў-бы фармальнае права заявіць, што *„польскія законы даюць беларусам родную школу, ды народ яе ня хоча браць!“*

Мы да гэтага ня можам і не павінны дапусьціць, ня гледзячы на тое, што нам пагражаюць розныя зьдзекі і надужыцьці цераз меру „патрыятычна“, хоць і далёка не заўсёды „praworządnie“, настроеных нашых „апякуноў“. Наадварот, ніякія перашкоды ў зьдзейсьненьні нашых правоў не павінны нас скланяць да зрачэньня самахоць гэтых правоў. Такое зрачэньне было-б роўназначна з нашым *самагубствам.*

Дык няхай-жа наша энэргія ў здабываньні таго, на што маем поўнае законнае права, не слабее. Няхай кожын беларускі інтэлігент у вёсцы, кожын сьвядомы беларус наагул тлумачыць сваім сярмяжным братом патрэбу ўсьцяж *падаваць усё новыя і новыя дэкларацыі з дамаганьнем роднае школы.* Яшчэ *два месяцы* маем да канца сёлетняга году. Гэты час мы і павінны выкарыстаць, закідаючы ўсе школьныя інспэктараты сваімі дэкларацыямі, даючы бясспрэчны доказ, што *беларусы ёсьць, жывуць і жыць хочуць.*

## Пасьля канфэрэнцыі меншасьцяў.

Толькі цяпер—ад учасьніка канфэрэнцыі нацыянальных меншасьцяў у Жэнэве, беларускага дэпутата Ф. Ярэміча,—даведаліся мы аб тым, што тамака было, бо польская прэса ўпорна аб гэтым... маўчыць!

Першую спробу супольнага выступленьня ўсіх нацыянальных груп, якія жывуць пад уладай чужых дзяржаваў, нельга лічыць зусім шчасьлівай. Праўда, зьехалася даволі многа дэлегатаў— ажно 56 — ад 14 нацыянальнасьцяў, налічваючых разам 30 міліёнаў душ,—але тыя вузкія рамкі, у якія паставілі нарады зьезду арганізатары яго, не маглі здаволіць усіх учасьнікаў.

Не маглі яны здаволіць перад усім беларусаў (дэп. Ярэміч) і ўкраінцаў (дэп. Паўло Васыньчук, Чэркавскі і сэн. Левчанівська). Не маглі здаволіць затым, што **беларусы і ўкраінцы**, зьяўляючыся „меншасьцямі“ ў Польшчы, раўнуючы да ўсяго насяленьня яе, **на сваей зямлі прадстаўляюць абсалютную большасьць.** І дзеля таго разьвязаньне беларускага і ўкраінскага пытаньняў у Польшчы непадзельна зьвязана з пытаньнем аб іх тэрыторыях,— і разьвязаньне гэнае беларусы і ўкраінцы прадстаўляюць сабе выключна на падставе прынцыпу нацыянальнага **самавызначэньня.**

Вось, беларускія і ўкраінскія дэлегаты і дамагаліся, каб на канфэрэнцыі абгаварываўся ня толькі голы прынцып культурна-нацыянальнае аўтаноміі, якія добры для народаў, ня маючых сваей нацыянальнай тэрыторыі, — але каб разглядалася палажэньне кожнае меншасьці і яе дамаганьні паасобку. Але на гэта большасьць дэлегацыяў не згадзілася,—у тым ліку не згадзілася і польская дэлегацыя ад польскіх меншасьцяў у Літве, Латвіі, Нямеччыне і Чэхаславікіі.

Гэта прымусіла беларусаў і ўкраінцаў адмовіцца ад чыннага ўчасьця ў канфэрэнцыі і падаць адпаведную заяву ў прэзыдыум канфэрэнцыі, у якім былі адведзены мейсцы і для дэлегатаў беларускага і ўкраінскага (па адным). Дэкларацыя іх зрабіла вялізарнае ўражаньне, і польская дэлегацыя, каб аслабіць гэтае ўражаньне і заглушыць голас беларусаў і ўкраінцаў, запрапанавала была, каб дэкларацыі прэзыдыум ня прымаў і не запісваў у пратакол. Аднак, гэты крок ня толькі не аслабіў, а ўзмацаваў значэньне беларуска-ўкраінскага выступленьня, і польская прапазіцыя была канфэрэнцыяй адкінута...

У чародным нумары мы дамо падробны агляд тых рэзалюцыяў, якія былі прыняты канфэрэнцыяй. Рэзалюцыі гэныя маюць на мэце паляпшэньне палажэньня ўсіх меншасьцяў у чужацкіх дзяржавах. Адзначым цяпер толькі тое, што, нягледзячы на адмову канфэрэнцыі пашырыць рамкі дыскусіі на **гэтай** сэсіі, паднятая беларусамі й украінцамі справа асталася адкрытай і, трэба спадзявацца, будзе пастаўлена на парадку дня на чароднай канфэрэнцыі, якая мае быць склікана 1 красавіка 1926 году. Прынамся ў **прэзыдыуме канфэрэнцыі**, які не распаўся з зачыненьнем канфэрэнцыі, а мае працаваць далей і падрыхтаваць парадак дня новай канфэрэнцыі,—**мейсцы для беларуса і ўкраінца захаваны**, і апошнія могуць прыняць учасьце ў выпрацоўцы праграмы на красавік ды гэтак правясьці тут свае дамаганьні.

У гэтым—вялікая маральная перамога беларусаў і ўкраінцаў. Гэта — доказ таго, што бяз учасьця такіх вялікіх па сваей лічэбнасьці тэрыторыяльных нацыянальнасьцяў, як беларусы і ўкраінцы, супольныя выступленьні нацыянальных меншасьцяў дзяржаў Эўропы ня маюць належнае вагі і значэньня.

І гэта—зусім зразумелая рэч: бо-ж нідзе нацыянальнае пытаньне не стаіць так востра, як у Польшчы—на нашых „Усходніх Крэсах“....

**Г. Б.**

## Аб выпадках у Базыльянскіх мурох.

З прычыны таго, што польская прэса згодна падала фальшывыя інфармацыі аб выпадках у Базыльянскіх мурох 22 кастрычніка с. г., а нашае апісаньне, сцьверджанае паказаньнямі абсалютна верыгодных сьведкаў, сканфіскавана ў № 14 з 24 кастрычніка „Жыцьця Беларуса“, абмяжоўваемся ў гэтым нумары толькі падачай зьместу тэлеграмаў, пасланых вышэйшай уладзе ў Варшаву.

Міністру Справедлівасьці
**ў Варшаве.**

Копія Міністру Унутраных Спраў. Копія дэпутату Тарашкевічу, Сойм.

22-га кастрычніка Дырэкцыя Публічных Работ у Вільні пры ўчасьці паліцыі прымусам выкінула з памяшчэньня Беларускага Прытулку, Вострабрамская 9, дзяцей, адміністрацыю і ўсе рэчы з мэтай аддачы сказанага памяшчэньня кіраўніку Архіву Студніцкаму. Выпаўняючы абавязкі дыжурнага сябра Беларускага Т-ва помачы ахвярам вайны сэнатар Вагдановіч такжа быў выдалены прымусам. Памяшчэньне запячатана. Дзеці месьцяцца на сьцюдзёным калідоры.

Пратэстуючы проці пагвалчэньня права адміністрацыйнай уладай, зварачаюся да пана міністра з просьбай даць загад, каб ураз было вернена парухапае ўладаньне.

(—) *Р. Астроўскі,*
Старшыня Камітэту Бел. Т-ва пом. ахв. вайны.

Сынод Праваслаўнае Царквы Зыгмунтоўская 13,
**Варшава—Прага**

Копіі: Міністру Рэлігійных Вызнаньняў, Міністру Унутраных Спраў.

Выпаўняючы даручэньне Куратара Віленскага Школьнага Вокругу № 21021, я загадаў заняць на патрэбы Сэмінарыі звольненае беларускай школай памяшчэньне ў гмаху Сэмінарыі пры Вострабрамскай вул. № 9. Зьмешчаная мною ў сказаным памяшчэньні часьць інтэрнату Сэмінарыі сягоньня сілай выкінута паліцыяй панствовай з ужыцьцём гвалту над асобамі вучняў і інспэкцыі Сэмінарыі. Памяшчэньне запячатана, пастаўлена паліцэйская варта.

Ня гледзячы на маю просьбу прыпыніць гэты акт да паразуменьня з цэнтральнай уладай, паліцыя ў часе маей інтэрвэнцыі ў Дэлегата Ураду ўчыніла сказанае пагвалчэньне права.

Паведамляючы аб вышэйшым, прашу Сынод Праваслаўнае Царквы аб інтэрвэнцыю ў рашаючых чыньнікаў Ураду і аб прысылку загаду аб аддачы ўраз-жа сказанага памяшчэньня законнаму ўласьніку яго — Праваслаўнай Царкве—дзеля патрэб Сэмінарыі.

(—) *Антоній,*
Япіскап, Рэктар Сэмінарыі.

## Апэляцыя украінцаў да сусьветнай апініі.

Учасьнікі кангрэсу нацыянальных меншасьцяў у Жэнэве—украінскія паслы і сэнатары зрабілі прадстаўніку швайцарскага тэлегр. агенцтва гэткую заяву:

Як і ў мінулыя гады, і сёлета польскія ўлады зрабілі масавыя арышты сярод украінцаў, асабліва на Валыні і ў Палесьсі. Арыштоўваецца пераважна ўкраінская інтэлігенцыя. Крывадушным апраўданьнем гэтых арыштаў улады выстаўляюць рэвалюцыйны камуністычны рух, які імкнецца да адарваньня ўкраінскай тэрыторыі ад Польшчы і злучэньня з Радамі. Дык вось прадстаўнікі ўкраінскага народу ў Польшчы сцьвярджаюць перад усім сьветам, што пад прыкрыцьцем гэтых закідаў польскі ўрад узапраўднасьці вядзе барацьбу не з камуністычным рухам, але з украінскім народам. Проці 7-мільённага ўкраінскага народу тасуецца пляновая сыстэма гвалтаў, пазбаўляючая яго элемэнтарных нацыянальных правоў. Шмат пачатковых школаў зачынены ці перароблены на польскія, ня гледзячы на новы закон, які загадвае адчыненьне новых. Украінскі ўнівэрсытэт і палітэхнікум у Львове істнуюць падпольна. На ўкраінскай зямлі насаджаны дзесяткі тысяч польскіх асаднікаў. Стогнучы пад гэтым ярмом украінскі народ праз вусны сваіх прадстаўнікоў апэлюе да сусьветнай апініі...

„Голас гукаючага ў пустыні“. — Ведама-ж, „сусьветная апінія“ яшчэ мацней зацісьнена ў кулак апошнім паразуменьнем Чэмбэрленаў, Брыянаў, Штрэзэманаў, Мусоліні, Бэнэшаў і Скшыньскіх... — Дык не папсуе ім на бліжэйшы час добрага апэтыту.

# Сойм.

## Узнаўленьне працы Сойму.

20-га кастрычніка распачаліся йзноў пасьля перарыву паседжаньні Сойму.

На прапазіцыю марш. Ратая Сойм злучае дыскусію аб „сьпешных“ санацыйных праектах п. Грабскага з агульнай дыскусіяй аб бюджэце.

Першы прамаўляе эндэк **п. Гломбінскі**, які сцьвярджае, што прадстаўлены бюджэт на 1926 г.—завялікі для Польшчы, дык і нерэальны. Эндэкі хочуць зьмяніць выбарны закон, а пасьля толькі распусьціць Сойм. Што датычыць „пасьпехаў“ мін. Скшыньскага ў Лёкэрно, дык лідэр эндэкаў кажа, што пэўна толькі адно: што канфэрэнцыя перачыркнула Вэрсальскі Трактат і зрабіла немцам вялізарныя ўступкі.

Вызваленец **п. Столярскі**, адразу запрапанаваў выразіць недаверые ўраду, які, апіраючыся на абшарніках і прамыслоўцах, толькі руйнуе край, абрэзвае школьныя бюджэты. Аратар прапануе зараз-жа адкінуць і санацыйныя праекты няўоднага ўраду, дый распусьціць Сойм, назначыўшы новыя выбары чым хутчэй,—мо‘ і на канец студня 1926 г.

Востра насыпаў ураду братоў Грабскіх пасьля кароткага „мядовага месяцу“ іх „ашуканы каханак“. „Жыдоўскі Клюб“ у Сойме. **П. Фростіг** сцьвярдзіў, што ўрад зусім не здае сабе справы з таго, наскольні грознае сучаснае палажэньне Польшчы. Далейшым крокам на шляху да набліжаючайся катастрофы і зьяўляецца прадстаўлены ўрадам бюджэт, якога ня зможа вытрымаць зруйнаваная палітыкай абодвух талентных братоў Польшча. А да ўсяго гэтага ўрад п. п. Грабскіх і Скшыньскага, заключыўшых з імі ўмову, ашукаў жыдоў, на ўсім фроньце. Дык ці-ж могуць жыды ня трэбаваць адстаўкі гэткага шкоднага для Польшчы й крывадушнага адносна да жыдоў габінэту?!

Пасьля гэтага зараз-жа папрасіў слова сам прэм. **Грабскі**, каб спраставаць весткі, паданыя паслом Фростігам, у справе заграгічнай пазыкі ў банкіраў Ротшыльдаў і дзе інш. Сам прэм‘ер і міністар фінансаў сцьвярдзіў, што ён ня бачыў (яшчэ...) такіх людзей, якія, маючы грошы, хацелі-б даць пазыку Польшчы. Вось дык прынамся шчыра!

На гэтым першае паседжаньне і зачынілася.

---

Другое паседжаньне Сойму 21/X было занята далейшай агульнай дыскусіяй над бюджэтам на 1926 г., санацыйнымі праектамі Грабскага дый наагул — над усей палітыкай ураду.

Рэзкую і ядавітую прамову сказаў п. Бырка, прадстаўнік „Пяста“, рашуча перайшоўшага ў апазіцыю. П. Бырка—спэцыяліст у справах фінансаў, і ўсю сваю забойчую крытыку ён скіраваў пераважна проці „санацыйнай“ працы мін. фінансаў Грабскага.

Аратар сцьвярджае, што, замест ашчаднасьці, да якой заклікае цяпер Грабскі, яго ўрад за час „санацыі“ папросту „скарміў“ сваей бюракраты! (зужыў на бюджэтныя выдаткі) запасаў на 701 з чверцяй мільёна злот., ці ў тры разы менш, як тое, што Аўстрыя выдала на сваю фінансавую санацыю. А да таго трэба яшчэ дадаць 35 міл. даляраў (каля 200 мільёнаў злотых) амэрыканскай пазыкі, якую таксама зьела Польшча, хаця Грабскі бажыўся амэрыканцам, што за гэтыя грошы зробіць у Польшчы шмат карысных для краю рэчаў. У выніку гэткай „санацыі“ цяпер у Польшчы ўсе касы пустыя. Тады Грабскі, ратуючыся ад банкруцтва (каб прынамся заплаціць пэнсіі ўрадоўцам), пачаў запіхваць гэтыя касы білёнам (скарбовымі, але не банковымі, непакрытымі грашмі). За адзін жнівень гэткага білёну выпушчана на 146 мільён. злотых. Што рабілася далей з білёнам, скольні яго цяпер,—аб гэты мы ня ведаем нічога, бо ўрад не падае больш лічбаў яго. Гэты білён—запраўдная новая валюта, якіх у Польшчы цяпер — дзьве, што прызнаў цяпер і сам Грабскі. Грабскі нарэшце ўжо ня мог скрываць грознага палажэньня і прызнаўся, што ўрад яго „прайграўся да апошняй ніткі“.

Цяпер Сойму прадстаўлены — „новая“ праграма „санацыі“ скарбу і—зусім нерэальны бюджэт. Бюджэт завялікі для Польшчы. Трэба бязьлітасна абрэзаць яго, пачаўшы ад Прызыдыуму Рады Міністра і выдаткаў на прэсавую барацьбу з Соймам.

П. Бырка кажа, што да ўраду, які маніць у афіцыяльных камунікатах, каб толькі ўтрымацца на міністэрскіх крэслах, які змарнаваў цяжка дастаўшуюся—на варунках, якія ставяцца толькі банкруту, — заграгічную пазыку, яго клюб даверыя мець ня можа, а тым больш даваць яму новыя паўнамоцтвы на новыя пазыкі. Урад, які ламае свае ж законы, які цыркулярамі фальшуе свае-ж уставы, які руйнуе край быццам дзеля скарбу, а пасьля таго — руйнуе той-жа скарб, павінен быць прыцягнуты да адказнасьці. Трэба стварыць соймавую камісію з 7 сяброў, з неабмяжаванымі паўнамоцтвамі, якая-б паддала кантролю ўсю грашовую гаспадарку ўраду; камісія мае здаць справаздачу Сойму, а тады паглядзімо, што далей рабіць з урадам.

Няменш забойчую, хаця больш мягкую па форме, крытыку ўраду братоў Грабскіх даў іх нядаўны таварыш і найбліжэйшы супрацоўнік **п. Тугутт.**

Ён таксама сцьвярджае, што бюджэт — завялікі для згалелага краю і зусім ня рэальны ў аблічэньнях спадзяваных даходаў. Грабскі сказаў, што „для Польшчы канон (закон) — 2-х мільярдавы бюджэт. Але-ж гэта папросту стара-шляхоцкі форс на пустую кішэнь. Як казалі даўнейшыя паны (дый цяпер таксама),—„залажыся жыду, але пакажыся“, — датрымай панскага шыку. Але Польшчы папросту ня хопіць на гэткі бюджэт. Дый ужо пачалі яе закладаць (манаполі) і якраз жыду, як сцьвярдзіў пас. Фростіг.

Перад усім трэба рашуча абмежаваць выдаткі на армію, скараціўшы і час службы ў войску. Варта было б таксама спыніць нарэшце вельмі каштоўныя для скарбу зладзействы і надужыцьці ў міністэрстве пана ваеннага міністра.

Трэба спыніць непасільныя выдаткі і на асьвету. Польшча ня можа ўтрымаць 6 унівэрсытэтаў, дык абойдзецца і паловай іх. Закладаецца Гандлёвая Акадэмія, але адначасна спыняецца магчымасьць гандлю ў краю. Дык і з тым можна пачакаць.

Трэба абмежаваць цэразмерную лічбу ўрадоўцаў і паліцыянтаў. Шмат праектаваных у бюджэце пекных і пышных гмахаў можа яшчэ пачакаць. Наагул бюджэт трэба скараціць на 40 проц. (амаль не напалову), дый рабіць гэта не нясьмелай рукой, але папросту — сякерай.

Створаны Грабскім злоты меў на 40 проц. пакрыцьця золатам, а на 60 проц. — даверыем краю да асобы і талентаў Грабскага. Цяпер гэтае ўсё забясьпечаньне злотага, як валютнае, так і маральнае, катастрафічна змалела. Дзіва-ж, што злоты паляцеў! Цяпер трэба новага міністра скарбу, які-б перад усім быў шчыры,—трымаўся слова і ня зводзіў краю. Добры міністар скарбу павінен рабіць толькі тое, на што дазваляе нашае польскае ўбожства, а не падкупляць клюбы і партыі, каб утрымацца. Урэшце, ён павінен хацець і ўмець працаваць разам з Соймам.

Усім гэтым варункам, нажаль, не адпавядае пан Грабскі. Сойм нічога ня ведае аб тым, як гаспадаруе

# Зьезд былых палітычных вязьняў.

У Лодзі толькі што адбыўся ўсепольскі зьезд былых вязьняў палітычных-палякаў, якія сядзелі ў свой час па царскіх вастрогах. Паміж іншым, успомнілі гэтыя былыя вязьні і аб тых вязьнях, якімі цяпер набіты, як бочкі селядцамі, вастрогі Польскай Рэспублікі. Дзьве рэзалюцыі, прынятыя зьездам у гэтай справе, найляпей адказываюць на пратэст паноў польскіх пісьменьнікаў проці „напасьці“ францускіх дзеячоў на польскую адміністрацыю і паліцыю (за тасаваньне белага тэрору). Вось, гэтыя рэзалюцыі:

1) Зьезд урачыста пратэстуе проці гвалтаў, тасаваных да палітычных вязьняў усюды, дзе палітычныя вязьні знаходзяцца, і — дамагаецца спыненьня гвалтаў над палітычнымі вязьнямі ў імя чалавечнасьці.

2) Зьезд, заяўляючы ўрачысты пратэст з прычыны тасаваньня кары сьмерці, трэбуе, каб кара сьмерці безадкладна была выкінута з угалоўных кодэксаў (дзеючых у Польшчы). Адначасна зьезд трэбуе скасаваньня даразных судоў.

Пасьля гэтага прыняты рад прапазіцыяў, каб дамагацца ад ураду: зьмены законаў, датычучых палітычных справаў, увядзеньня судоў прысяжных (ганьба, але—няма іх, за выняткам Галіччыны); выкараненьня пануючай сыстэмы паліцэйскай правакацыі (о, гэта дык ёсьць!), апрацаваньня вастрожнага статуту, абавязковага для адміністрацыі і гарантуючага вязьняў ад зьдзекаў і абражаньня іх чалавечай годнасьці; аддзяленьня палітычных вязьняў ад угалоўных і — судовай рэпрэсіі проці паліцэйскіх і адміністрацыйных урадоўцаў за надужыцьці адносна да вязьняў.

На зьезьдзе верхаводзілі пэпээсы, якія калісьці, здаецца, толькі адны з палякоў сядзелі ў царскіх вастрогах. Цяпер і яны самі ўжо не сядзяць у вастрогах Польскай Рэспублікі, але толькі падтрымліваюць у Сойме той польскі ўрад, што фаршыруе (пераважна не палякамі) свае рэспубліканскія вастрогі. Дык калі ўжо і пэпээсы загаварылі аб тым, што францускія дзеячы называюць „белым тэрорам“ у Польшчы, дык значыць... нешта-ж такі ёсьць, паны „сьветачы польскай літэратуры“!..

---

# „СЫМОН МУЗЫКА“.

Сярод беларускіх літэратурных крытыкаў няма згоды ў паглядах адносна да пытаньня: каго трэба лічыць найвялікшым нашым паэтам? Галасы дзеляцца паміж двума: Янкай Купалай і Якубам Коласам.

І гэта даволі натуральна: бо-ж яны гэткія розныя, гэтак адзін да аднаго непадобныя, штоапрача об‘ектыўнае ацэнкі—тутака ўваходзяць у ігру і асабісты густ крытыкаў, і іх упадабаньні і настроі. Адных захоплівае шырыня і размах творчае мысьлі Купалы, яго магутныя парываньні, гучнасьць яго вершу, сьмеласьць абразоў. Другіх чаруе мяккасьць паэзіі Коласа, духовая гармонія і такое поўнае зьліцьцё душы песьняра з прыродай і сваім народам, што між чытачом твораў Коласа і аўтарам іх зразу завязываецца нейкая асаблівая блізкасьць, інтымнасьць. Але ўсе крытыкі бясспрэчна адводзяць Купале і Коласу першыя мейсцы на беларускім Парнасе.

Аднак, істнуе і яшчэ адна об‘ектыўная прычына, якая робіць асабліва трудным вырашэньне пытаньня: каторы першы? Гэта—тое, што пад той час, як Купала як-быццам ужо дайшоў да найвышэйшага пункту сваей творчай сілы і стуль горда паглядае на сьвет, задзіўляючы магутнасьцяй свайго таленту, але не даючы ўжо нічога неспадзяванага, а рэчы роўнае цаны,*) —Колас яшчэ не дайшоў да свайго зэніту, і яго апошнія творы ясна паказуюць, што ўзыходжаньне ўверх у яго ня спынілася.

У творчасьці Коласа ўсё яшэ зьяўляюцца рэчы, якія паказуюць, што талент яго далей расьце і ўзбагачваецца. Да такіх твораў належыць і яго апошняя поэма „Сымон Музыка“.

Ня ўся гэтая поэма — новая: тры першыя часьціны яе напісаны ўжо даўно і надрукаваны ў 1918 годзе, — а дзьве апошнія часткі выйшлі ў сьвет толькі цяпер—разам з даўнейшымі ў новай апрацоўцы і ў новым мастацкім выданьні Дзяржаўнага Выдавецтва Беларусі ў Менску. І вось, стаўляючы побач пачатак „Сымона Музыкі“—ў яго першай рэдакцыі з цяперашнім поўным выданьнем, мы ясна бачым, што Колас запраўды не стаіць на мейсцы ў разьвіцьці ягонага таленту.

Колас ахвяраваў сваю поэму беларускай моладзі. Да яе поэт і звaрачаецца ў вершу, зьмешчаным, як уступ да поэмы, і ўжо гэты верш зьяўляецца мерай мастацтва Коласаўскае творчасьці. Але, апрача хараства формы і глыбокага пачуцьця, Колас гэтым вершам пацьвярджае нашую кароткую характэрыстыку істоты яго творчасьці,—іменна тое, што чар поэзіі Коласа—у адбіваньні ею беларускага жыцьця і беларускае прыроды.

Ад роднае зямлі, ад гоману бароў,
Ад казак вечароў,
Ад песень дудароў,
Ад сьветлых воблікаў пакінутых дзяцей,
Ад шолаху начэй,
Ад тысячы ніцей,
З якіх аснована і выткана жыцьцё
І злучана быцьцё і нябыцьцё,—
Зьбіраўся скарб, струменіўся няспынна,
Вясёлкавым ірдзеньнем мне сьпяваў,
І выхаду шукаў
Адбітак родных зьяў
У словах—вобразах, у песьнях вольна-плынных.

Так проста—з чыста мастацкай прастатой — тлумачыць нам Колас зьяўленьне яго твору.

І гэты скарб, пазычаны, адбіты,
У сэрцы пераж ыты
І росамі абмыты
Дзяньніц маіх, дзяньніц маіх мінулых,
Для вас, душою чулых,
Як доўг, як дар,
Дае пясьняр.

---

Колас зусім справядліва выбраў нашу моладзь, каб абдорыць яе сваей поэмай. Бо-ж хіба нідзе ў Коласа не адбілася душа дзіцяці і пэрыад юнацтва так поўна, як у „Сымоне Музыцы“, хоць пасьвяціў ён гэтай справе цэлы рад дробных апавяданьняў вершам і прозай, ды многа радкоў сваей „Новай Зямлі“.

„Звычайная“ трагедыя дзіцячае душы, перарослае акружаючую яе сфэру, непанятае ею, неацэненае і—цагарджанае, ня гледзячы на ўкрыты ў ёй вялізарны скарб—талент поэта-мастака і музыкі,—вось зьмест поэмы. „Звычайная“, кажам, бо ўжо апрацовываная ў розных літэратурах, не далёка сягаючы — у польскай Сенкевічам, новэля якога „Janko Muzykant“ даўно пераклaдзена на беларускую мову і выдана асобнай кніжкай. Але апрацоўка яе Коласам такая асаблівая, такая мастацкая, такая багатая, што прадстаўляецца зусім арыгінальнай і самастойнай.

У вясковай хаце хлопчык, які зусім непадобны да іншых дзяцей, бо заўсёды заслуханы ў незмаўкаючую песьню вечна жывое ў-ва ўсялякіх праявах сваіх прыроды,—хлопчык, з якога ў хатняй гаспадарцы нямя ніякае карысьці,— такі хлопчык прадстаўляецца бацьком нейкай „закалай“, „няшчасьцем“. Яго ніхто ня любіць, яго жыцьцё не сагрэта матчынай ласкай, усе глядзяць на яго крыва.—„Тым ня любы, што адметны“...

Дык і ён цураецца хаты. Яго жыцьцё працякае ў полі, пасучы статак. Там ён радніцца з прыродай, там прачувае магутны кліч яе да творчасьці. Там разьвіваецца яго фантазія, шукаючы адказу на ўсе недаўменныя пытаньні, якія думка малога стараецца высьніць сабе — дарэмна. І ён творыць сабе свой уласны сьвет — сьвет фантазіі, выпрацоўвае свой асаблівы—анімістычны—сьветапагляд, уласьцівы беларусу наагул. Там-жа ён здабывае і магчымасьць выявіць свой музыкальны талент—пераказаць у гуках свае поэтыцкія абразы і настроі: дзед — пастух, які адзін толькі бліжэй зышоўся з Сымонам і зразумеў яго лепш, чым родныя бацькі, падараваў яму перш жалейку, а пасьля — перад сьмерцяй — адказаў яму ў спадчыне скрыпку.

Калі раз воўк парэзаў хлопцу авечак у полі, бацька ў злосьці выгнаў яго з хаты. І Сымон з неадступнай іскрыпкай пайшоў у сьвет... Для яго пачалося жыцьцё перш жабрака, які хадзіў з эксплёатаваўшым яго дзедам ад хаты да хаты, пасьля—музыкі ў карчме, дзе так сама эксплёатуе яго жыд-шынкар. Яго мары-лятуценьні аб нейкім новым жыцьці аказваюцца вельмі далёкімі ад таго, што яго запраўды спатыкае ў жыцьці....

Але на сваей дарозе ён сустрэў тое, да чаго так магутна ірвалася мо‘ несьвядома душа нікому ня любага дзіцяці: сустрэў спогад дзяўчынкі-падростка, які з абодвух бакоў ператвараецца ў любоў. І расьце душа ў Сымонкі, сагрэтая гэтай любоўю,разгараецца ў ім яшчэ больш творчы агонь. Вось-вось лёс, здаецца, вывядзе Сымона на шырокі жыцьцёвы шлях, на якім яго талент буйна закрасуе!

(Канец будзе).

---

*) Найнавейшыя творы Купалы сьведчаць аб эвалюцыі яго ідэалёгіі, але ня творчасьці. *А. Н.*

міністар скарбу. Дык перад усім павінен — даведацца. Дзеля таго п. Тугутт, ад імя Клюбу Працы, прапануе выбраць камісію з 7 сяброў, якая б із учыла стан польскага скарбу і ў працягу 2 тыдняў зложыла справаздачу Сойму. А тады—будзе відаць, што рабіць далей з урадам.

**П. Строньскі** сцьвярджае, што, як Грабскі сваім фінансавым, так Скшыньскі сваім дыпляматычным оптымізмам,—абодва папросту ашуківаюць край, закрываючы ад грамадзянства ўсё ўзрастаючую пагрозу катастрофы.

У Лёкарно Польшча пабіта сьмяротна. Канфэрэнцыя ў выніку зрабіла прынцыповую розьніцу між заходнімі і ўсходнімі граніцамі Нямеччыны, даўшы адным супольную гарантыю злучаных у „пакце“ дзяржаў і ня даўшы гэтай гарантыі граніцы польска-нямецкай. Няпраўду кажа мін. Скшыньскі, быццам усходні пакт злучаны ў адно з заходнім. Бо польска-француская гаранцыйная ўмова не падпісана нікім, апрача Польшчы і Францыі, дык нікаго, апрача іх, і не абязывае ні да чаго.

У выніку Канфэрэнцыі Нямеччына мае бясспрэчнае права аддаваць у міжнародавыя суды ўсе спрэчныя справы з Польшчай — навет і справы аб граніцах... Польскі міністар у Лёкарно згадзіўся на гэткае тлумачэньне § 16 Статуту Лігі, якое касуе францускую помач Польшчы ў выпадку нападу ня яе з усходу, але аблягчае нямецкую помач гэтаму Усходу... Гэтай згодай Польшча памагла Нямеччыне ўвайсьці ў склад Лігі, дзе яна засядзе, як сябра Рады, і будзе вырашаць разам з Англіяй усе польскія справы...

Перад Лёкарно саюз Польшчы з Францыяй быў зусім вольны і ў патрэбе самастойна даваў помач абедзьвюм старонам. Пасьля Лёкарно гэтая ўзаемная аружная помач саюзьнікаў будзе залежнай ад... трэцяй „асобы“: Ліга, ці папросту—Англія, можа ня толькі забараніць Францыі памагчы Польшчы, але навет можа змусіць усіх сяброў Лігі памагаць Нямеччыне...

У канцы, пасьля гэтых сумных заяваў, лідэр польскіх „хрысьціянскіх абшарнікаў“ горда заявіў: калі жэнэўскі пратакол, падпісаны 54 дзяржавамі, мог быць адкінуты Англіяй, бо на яго не згадзіліся яе доміній (самастойныя часткі Брытанскай Імпэрыі), дык і Польшча мае права і павінна адкінуць лёкарнскія заходнія пакты, бо і яе „доміній“—таксама проці гэтых умоваў...

У адносінах да ўраду клюб аратара—мякчэйшы: не жадае рабіць крызісу і зьмены ўраду, а хоча толькі зьмены пляну і праграмы ўраду.

Пэпэсавец **Жулавскі**, пасьля доўгай гутаркі аб сацыялізьме і „забойчай“ крытыкі ўраду (ад якога дастае ўсялякія „запамогі“, а перад усім на „прэсу“)... у канцы заяўляе, што найразумнейшая з усіх соймавых партыяў П.П.С. „ня будзе такой шалёнай, каб у такі крытычны (перад усім для выдаваньня яе газэты...) мамэнт замяняць адзін буржуазны ўрад на другі. Усё зло ня ў урадзе, але ў гэтым Сойме... Дзеля таго П.П.С. будзе галасаваць за перадачу ў камісію бюджэту і праектаў Грабскага (значыць за даверые ўраду), але паставіць прапазіцыю роспуску Сойму і новых выбараў.

---

На трэцім паседжаньні Сойму агульная дыскусія была скончана.

Корфантаўскія хадэкі, якіх так моцна намаўляў Корфанты, каб валілі Грабскага (сам ён хоча быць прэм'ерам), не паслухаліся свайго лідэра, і іх прамоўца згадзіўся на адасланьне ўсіх урадавых праектаў у камісіі.

Клюб Работнікаў-Нацыяналістаў таксама не галасуе проці ўраду, але дамагаецца роспуску Сойму.

Немцы рашуча выказваюцца проці ўраду, які страціў свой беспартыйны і нацыянальна-бесстаронны (калі-ж ён меў?..) характар, павінен выйсьці ў адстаўку.

Проці ўраду выступае і Клюб каталікоў-людоўцаў.

Прадстаўнік Беларускага Клюбу кс. Станкевіч востра крытыкаваў урад і высказаў яму недаверые. Што датычыць прадстаўніка Беларускай Работніцка-Сялянскай Грамады, дык яму маршалак зачыніў рот, запрапанаваўшы спыніць прамовы, пазбавіўшы голасу стаяўшага на чарзе п. Тарашкевіча. Сацыялістам на гэткае затыканьне вуснаў нялюбым Сойму дэпутатам з крайняй лявіцы зьяўляецца пэпэсаўскі віцэ-маршалак Морачэўскі...

Моцную, рэзка-апазіцыйную прамову сказалі Хруцкі ад Украінскага Клюбу і Ваяводзкі ад Незалежнай Сялянскай Партыі. Пасьля прамовы апошняга, у якой ён кляйміў сьвежа-тасаваныя ў Беластоцкім вастрозе катаваньні вязьняў, выступіў віцэ-міністар справядлівасьці, якога ўся лявіца спаткала сьвістам і крыкам: „Далоў прысуд з сьмерці“...

Віцэ-міністар сцьвярджае, што з 200 арыштаваных у Беластоку „камуністаў“ толькі некалькі заявілі, што іх білі, а некаторыя казалі, што ім толькі... „ўлівалі ў нос халодную ваду“...

Дык запраўды-ж: ці варта аб гэткай драбязе падымаць галас у Сойме?...

---

**Пасьля заканчэньня дыскусіі і абшырнага адказу прэм'ера Грабскага на зробленыя яму закіды Сойм большасьцяй каля 30 галасоў адкінуў прапазіцыю аб выражэньні ўраду п. Грабскага недаверыя. Уратавалі ўрад паны пэпэсы, якія галасавалі разам з правіцай...**

---

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

---

# Важнейшыя здарэньні.

## У Польшчы.

### Нячуваны нідзе інш зьезд.

„Виленское Утро“ паведамляе, што 20 кастрычніка ў Варшаве адчыніўся ў міністэрстве ўнутраных спраў, дый пад старшынствам міністра Рачкевіча, зьезд усіх ваяводаў і... усіх куратараў школьных акругоў Польшчы!

Што гэта такое? Ці ўжо й юрыдычна былое „міністэрства асьветы“ перайшло ў „міністэрства паліцыі“; ці справа „пашырэньня асьветы“ па новым плянам і праграмам Ст. Грабскага вымагае такога цеснага паразуменьня і „кантакту“ з адміністрацыйна-паліцэйскай уладай у краі, што вышэйшыя прадстаўнікі асьветнай улады на мясцох запрошаны п. Рачкевічам на гэткія „курсы“ разам з ваяводамі?..

У кожным разе можна сцьвярдзіць, што нідзе, навет у наскрозь паліцэйска-царскай Расеі, немагчыма было-б штось падобнае да таго, што дзеецца ў белы дзень у „дэмакратычнай“ і „канстытуцыйнай“ Польшчы.

### Канфлікт між аб'яднаным польскім вучыцельствам і мін. асьветы Грабскім.

З прычыны „новага пляну школьніцтва ў Польшчы“, апрацаванага мін. Грабскім дзеля падачы ў Сойм, узгарэлася гарачая барацьба між міністрам і польскім вучыцельствам. Абедзьве польскія вучыцельскія арганізацыі рэзка высказаліся проці праекту Грабскага, які — „у высокай меры пагражае паніжэньнем культуры, як шырокіх масаў народных, таксама шырокіх колаў інтэлігенцыі“.

Вось, запраўды дзівакі: але-ж якраз гэта-ж і патрэбна для таго, каб Польшчай круцілі гэткія „міністры асьветы“, як Мікулоўскія, Міклашэўскія, Грабскія і падобныя да іх.

### Суд над Мурашкай.

У Наваградку адбыўся суд над Мурашкай, паліцыянтам, які забіў Багінскага і Вечаркевіча.

На судзе, паміж іншым, было выясьнена, што Мурашка вызначаўся заўсёды зьверскімі зьдзекамі над людзьмі.

Суд — за забойства двух вязьняў, памілаваных Прэзыдэнтам і назначаных на замену на радавых вязьняў—палякоў,—засудзіў Мурашку аж на... 2 гады вастрогу, залічыўшы 6 месяцаў, якія той ужо прасядзеў у вастрозе да суда.

Цераз паўтара году Мурашка зноў будзе на волі.

### Уваскросшая справа Біспінга.

Галосная справа абшарніка Біспінга, добра ўеўшагася суседняму беларускаму сялянству і спаліўшага в. Рымуцяўцы ў часе нямецкай эвакуацыі (ён асабіста сам падпаліваў хаты), — справа яго аб забойства кн. Друцка-Любэцкага будзе зноў разглядацца 3 лютага 1926 года.

Да вайны расейскі суд прызнаў яго вінаватым і засудзіў на многалетні вастрог. Цікава, як аднясецца да польскага пана—польскі суд?

### Дарагоўля ў Польшчы ўсё расьце.

„Robotnik“ піша, што дарагоўля ў Варшаве ўсё расьце. За тыдзень ад 4 да 10 кастрычніка кошты ўтрыманьня йзноў узрасьлі на 1.67 проц. За папярэдні тыдзень узрост быў значна меншы — бо толькі на 0,74 проц.

Гэта ў сярэднім значыць, што тое, што 2 тыдні назад каштавала 1 злоты, цяпер каштуе даражэй на паўтраця гроша.

Але-ж кожны з нас ведае, што на дзеле дарагоўля расьце шмат шыбчэй, дый усё пераважна на найпатрэбнейшыя для працоўных тавары.

## Заграніцай.

### Нямецкая прэса аб канфэрэнцыі ў Лёкарно.

Заграністая прэса, а перад усім—нямецкая амаль не цалком занята рэзультатамі Лёкарнскай канфэрэнцыі.

З яе перад усім можна атрымаць пэўнае паняцьце аб запраўдным зьмесьце трактатаў.

Ведамы публіцыст Вольф піша, што нямецкай дэлегацыі ўдалося спараліжаваць францускія гарантыі для ўсходніх пактаў і дабіцца вынятковай пазіцыі адносна да § 16 Статуту Лігі.

Другая газэта піша аб перамозе Нямеччыны над дамаганьнем Польшчы злучыць у адно заходні пакт з усходнім.

„Фоссава газэта“ дае агульны зьмест Рэйнскага Трактату 5 заходніх дзяржаў. Усе яны абязаліся паміж сабою не рабіць спробаў зьмены граніцаў паміж імі шляхам аружнай сілы. Наагул, усялякая наступацельная вайна паміж імі недапусьціма. Усе споркі і спрэчкі паміж імі аддаюцца ў разьемчыя суды з найвышэйшай інстанцыяй у Лізе Народаў і Гаагскім Трыбунале. Сіла прысудаў разьемчых судоў для справаў між гэтымі 5 дзяржавамі таксама гарантавана ўсімі імі. Што датычыць § 16 аб удзеле ўсіх сяброў Лігі ў ваенных і эканамічных прымусовых мерах проці нарушыцеля мірнага пакту, дык Нямеччына, з прычыны яе разбраеньня й асаблівых гаспадарчых варункаў, амаль што ня звольнена зусім ад прадбачаных гэтым § абавязкаў, дый фактычна, як сябра Рады Лігі, можа заўсёды затрымаць усялякае аб гэтым рашэньне Рады, бо для такой пастановы Рады патрэбна згода ўсіх сяброў. Што датычыць усходніх разьемчых пактаў, дык яны ня зьвязаны з заходнім, дый ніякіх гарантыяў сілы іх рашэньняў заходні пакт 5 дзяржаў не дае. Гарантуе іх толькі сама за сябе—на моцы сваіх асобных дагавораў з Польшчай і Чэха-Славакіяй—Францыя.

Аб фактычнай моцы гэтай гарантыі мы ўжо пісалі раней.

### Нямецкі ўрад аб выніках канфэрэнцыі.

Нямецкі прэм'ер Лютэр заявіў журналістам, што заходні пакт фактычна споўніў тыя нямецкія варункі ўваходу ў склад Лігі Народаў, якія былі пастаўлены Нямеччынай яшчэ ў мэмарыяле 9-га лютага і 20-га ліпня, але тады былі адкінуты Францыяй.

Канфэрэнцыя наагул працавала па лініі нямецкіх інтарэсаў. Тлумачэньне § 16 прынята ў духу нямецкіх дамаганьняў. Хоць ня ўсе дамаганьні нямецкай дэлегацыі былі споўнены, але пакт і ў гэтым карысны ўжо тым, што адчыняе далейшыя магчымасьці, на што нямецкая дэлегацыя атрымала запэўненьні англійскага, францускага і бэльгійскага міністраў. Першым крокам на гэтым далейшым шляху і будзе дамаганьне скасаваньня акупацыі.

### Француская прэса аб Лёкарно.

Француская левая прэса наагул захопліваецца памысным для Францыі канцом канфэрэнцыі. Яна лічыць Лёкарно найвялікшым фактам сусьветнай гісторыі пасьля вайны, выхваляе дыплёматычную лоўкасьць Брыяна.

Правая прэса наадварот—падчырківае, што Польшча фактычна не атрымала ніякіх гарантыяў, што нямецкая дэлегацыя здалела ізаляваць (адасобніць) Польшчу, што ўсходнія разьемчыя ўмовы ня маюць фактычнай сілы, што наагул канфэрэнцыя аслабіла найбольш гарантаваўшыя Францыю яе ваенныя дагаворы з Польшчай і Чэха-Славакіяй.

### Яшчэ адна канфэрэнцыя!..

Каб устанавіць эканамічную раўнавагу сьвету, Ліга Народаў пастанавіла да сьнежня месяца склікаць прадстаўнікоў усіх дзяржаў. Маюць зьехацца выдатныя эканамісты, дзеячы работнікаў і статысты.

Пэўна, без эканамічнага „пакту“ „пакт бясьпечнасьці“ можа аказацца зусім нямоцным.

### Грэцкі ўльтыматум Баўгарыі.

У Грэцыі даўно йдзе глухая барацьба між рэспубліканцамі і манархістамі. Ведама, што манархізм у Грэцыі аканчальна скампрамітаваўся ў выніку апошняй няўдалай вайны з Турцыяй. Дык дзіва, што цяпер манархісты шукаюць нагоды, каб праз новую, але пабедную вайну з кім бы ні было—вярнуцца да даўнага ладу. А ці-ж можа быць „матэрыял“ больш прыгодны дзеля гэткага рэваншу, як Баўгарыя, пабітая столькі разоў, разброеная, пакінутая ўсімі народамі за грахі сваіх цароў, дый да таго яшчэ зруйнаваная бясспынным тэрорам цанкаўскага ўраду?..

І вось, як па-пісанаму, — на грэцка-баўгарскай граніцы справакаваны „інцыдэнт“, (ведама-ж—„напад баўгарскіх дывэрсантаў“), пасьля грэцкі ўрад паслаў Баўгарыі „ўльтыматум“ (неадкладнае дамаганьне), каб у працягу 28 гадзін баўгарскі ўрад заплаціў 2 мільёны франкаў адшкадаваньняў і пакараў вінаватых... А калі ня выпаўніць абразьлівага дамаганьня (акурат такі-ж ультыматум выслаў 2 гады назад Мусоліні Грэцыі і акупаваў востраў Корфу), тады Грэцыя пойдзе вайной на Баўгарыю...

Апошнія тэлеграмы кажуць, што на грэцка-баўгарскай граніцы ўжо йдзе фармальны бой...

### Новы Сойм у Латвіі.

3-га і 4/X адбыліся выбары ў Латвійскі Сойм. Акуратна яшчэ ня ведама вынікаў выбараў. Ведама толькі, што выбары не далі ані нацыянальнай ані сацыяльнай большасьці, як ня было яе і ў папярэднім Сойме.

Наагул, з выбараў відаць, што левы элемэнт пераважае над правым,—сацыяльная крысталізацыя шырыцца.

На прэзыдэнта сацыялісты высоўваюць вядомага паэта й заслужанага правадыра латышскіх сацыялістаў—п. Райніса.

### Сьмерць румынскага анархіста ад галадоўкі.

Засуджаны на вечную турму Макс Гольдштайн памёр у турме ў Дольфтані ад галадоўкі. Гольдштайн быў галоўным зачыншчыкам бомбавага пакушэньня, зробленага чатыры гады назад у румынскім нацыянальным тэатры, дзякуючы чаму былі забіты міністар справядлівасьці Грацыяну і япіскап Зьміцер Раду.

### Дачка Керзона членам Партыі Працы.

Дачка вядомага англійскага консэрватыўнага палітыка і міністра, нябожчыка лёрда Керзона, якая вышла замуж за сацыялістычнага рэдактара, — афіцыяльна ўвайшла ў склад Партыі Працы і, у выпадку выбараў, будзе першым кандыдатам ад гэтае партыі да парляманту.

### Статыстыка сучаснага СССР.

Апошні гадавік Галоўнага Статыстычнага Камітэту СССР дае гэткія галоўныя лічбы і даныя.

Усяго насяленьня ў СССР 132 міліёны, 413 сталых жыхароў і 1 міліён 200 тысячаў дачасных эмігрантаў з розных дзяржаў.

Уся тэрыторыя Саюзу складаецца з 10 незалежных рэспублік, 11 рэспублік аўтаномных і 11 аўтаномных краін. На ўсю лічбу нясяленьня расейцаў (вялікаросаў)—52 працэнты; іншых нацыянальнасьцяў—48 %.

Праваслаўнага насяленьня—82%.

Уся зямля ССРР падзелена ў выніку рэвалюцыі так: Сяляне — беззямельныя і малазямельныя—і работнікі атрымалі 97 працэнтаў, рэшта 3% атрымалі дзяржаўныя і вайсковыя гаспадаркі. Гэткім чынам у ССРР усялякае панскае—непрацоўнае—уладаньне зямлёй скасована дарэшты і назаўсёды.—Селянін-хлебароб стаўся адзіным і выключным гаспадаром сваёй зямлі ў сваей дзяржаве.

### Спорт у Нямеччыне.

Немцы па Вэрсальсаму Трактату ня маюць права трымаць большую армію, як у сто тысяч, каб ня мелі магчымасьці ваяваць. Але-ж немцы зьвярнулі ўвагу на сваю моладзь так, каб яна, у часе патрэбы, была зусім здольнаю да абароны бацькаўшчыны. Дзеля гэтага моладзь нямецкая згуртавана ў спартовыя таварыствы, гдзе працуець над сваім здароўем і фізычнаю сілаю. У гэтым годзе там істнуе 57.823 спартовыя таварыствы, у якіх згуртаваны 6.971.500 членаў. Чуць аж ня сем мільёнаў!,. Вось, тут-та і парука, што нямецкая нацыя не загіне.

Ці дачакаемся мы, каб і ў нас былі гэткія гурткі?

## ХРОНІКА.

**Францускія дэпутаты і беларусы.** У нядзелю 18 кастрычніка ў Вільню прыяжджала група дэпутатаў францускага парляманту, каб пазнаёміцца з тутэйшымі палітычнымі згуртаваньнямі і іх паглядамі ды імкненьнямі. На жаль, польская ўлада пазбавіла іх магчымасьці пазнаёміцца з паглядамі і настроямі беларускага грамадзянства, падставіўшы, замест запраўдных беларусаў, кумпанію пана „доктара“ Павлюкевіча, якая ўся есьць хлеб з ласкі польскага ўраду... Ведема, кумпанія гэная заявіла французам тое, што ім было прыказана: што ў Польшчы беларусам ня жыцьцё, а—„маліна“, ды што інакш кажуць толькі... камуністы! Так сама былі ахарактэрызаваны і беларускія паслы....

Драбнеюць гэныя „адзіныя запраўдныя прадстаўнікі беларускага народу“, якіх польская ўлада прадстаўляе французам! Маршалку Фошу дык прадстаўлялі прынамся запраўднага беларуса „польскае орыентацыі“, Дубейкоўскага, ды „бывшага бѣлорусса“ Ладнова. У Вільні-ж прышлося выставіць маскаля-савінкоўца, афарбаваўшагася ў „бѣлоруссы“ з чыста спэкуляцыйнай мэтай!

Як падаюць газэты, францускія дэпутаты вельмі цікавіліся справай беларуска-польскіх адносінаў—не ў паліцэйска-дэфэнзыўным маштабе, а **запраўднымі,**—значыць, тым, аб чым агентам польскае стараны якраз гаварыць не выпадала! Дый няўжо-ж хто можа думаць, быццам францускія госьці так і не даведаюцца, на якім маскарадзе яны былі?!....

**Суботнік у Віл. Белар. Гімназіі.** У суботу 24/X ў Віленскай Беларускай Гімназіі ладзіўся суботнік для малодшых клясаў. У праграме суботніку былі: вучнёўскі хор пад кіраўніцтвам п. Шнаркевіча, струнны аркестр пад кіраўніцтвам п. Дзешкіна і дэклямацыя вучняў малодшых клясаў.

**Лекцыя гр. А. Луцкевіча.** У нядзелю 25.X. гр. А. Луцкевіч лекцыяй на тэму: „Вільня ў беларускай літэратуры“ распачаў цыкль лекцыяў, якія будзе ладзіць Белар. Студ. Саюз у 1925—26 г., пасьвячоных беларускім справам.

Асоба лектара, а таксама жыцьцёвасьць і зацікаўленасьць тэмаю лекцыі прыцягнула вялікі наплыў слухачоў. Каб зазнаёміць пазавіленскія кругі грамадзянства з гэтым цікавым і актуальным пытаньнем, рэд. „Студ. Думкі“ ўсю лекцыю зьмесьціць у чародным нумары „Студ. Думкі“ і выдасьць у асобнай брашуры.

**Паведамленьне.** Урад Беларускага Студэн. Саюзу паведамляе новаўступіўшых у ўнівэрсытэт студ. беларусаў і старых сваіх сяброў, што сэкратарыят Саюзу (Віленская 12—6) функцыянуе ў аўторкі, чацьвяргі і суботы ад 6—8 гадз. увечары.

Усіх калегаў Урад Б.С.С. просіць зарэгістравацца ў Саюзе.

**Зьмена граніцаў ваяводзтваў.** У адміністрацыйнай камісіі Сойму разглядалася справа перамены граніцаў Палескага, Навагрудзкага і Віленскага ваяв. Па некалькі валасьцёў пераходзіць з аднаго ваяводзтва ў другое. Цэнтр Навагрудз. ваяв. пераносіцца ў Слонім, цэнтр Палескага—у Бярэсьце.

**Арышты ў Навагрудчыне.** 20.X у Навагрудчыне арыштованы **150 асоб,** якім закідаюць камунізм. Арыштаваны доўга шуканыя камуністы Булыг, Калюковіч і Шын.

**„Нішчэньне камунізму у Беласточчыне“.** Пад такім сэнсацыйным загалоўкам „Słowo“ паведамляе аб масавых вобысках і арыштах у Беласточчыне. Арыштована дагэтуль больш за 40 асоб. Ведама, не абыйшлося і без знаходу „бібулы“ і—„аружжа“, хаця газэта не падае, якога роду і ў якім стане было гэнае грознае аружжа....

**Лёс арыштаваных у Вільні.** Спасярод 117 асоб арыштованых у Вільні, 45 звольнены, а 72 пасаджаны ў вастрог на Лукішкі.

**Галадоўка ў Лукішскім вастрозе.** Надовячы карэспандэнт „Gaz. Por. Warsz.“ падаў вестку, што палітычныя вязьні на Лукішках у Вільні аб'явілі галадоўку.

Судзячы паводле таго, што б. рэдактары беларускіх газэт, Антон Войцік і Мікалай Шыла, адмовіліся прыняць страву, пасланую ім у вастрог у гэтую нядзелю, галадоўка трывае ўжо некалькі дзён. Прычыны яе—няведамы.

**Ці тая-ж рука?** Эндэцкая „Gazeta Poranna Warsz.“ надрукавала тэлеграму з Вільні гэткага зьместу:

„Вобыскі і арышты ў Ашмянскім павеце ў сувязі з праведзенай ліквідацыяй камуністычнае партыі Заходняе Беларусі далі ў рукі ўладаў вельмі багаты матэрыял. Вось жа, апрача вялікае сколькасьці камуністычнае „бібулы“ і адозваў, у Ашмяне знайшлі выбуховыя матэрыялы, піроксылін і дынаміт. Улады робяць дасьледы, ці знойдзеныя выбуховыя матэрыялы не паходзяць з тэй-жа крыніцы, як і знойдзеныя ў Базыльянскіх мурох пад сьв.-Траецкай царквой **скрыня з дынамітам і піроксылінам**“.

Мы перакананы, што тут працавала **тая самая „фаховая“** рука правакатара, што і ў Вільні. Аб гэтым сьведчыць факт, што тая „інформацыйная крыніца“, аб выкрыцьце якое мы дарэмна звварачаліся публічна да пракуратуры, далей ілжэць аб знойдзеных у Базыльянскіх мурох выбуховых матэрыялах: ранейшая малая скрыначка з дынамітам, як здаецца, старым і зусім ні да чога ня годным (суд свайго вываду аб гэтым так сама дагэтуль ня даў!), **вырасла цяпер ужо ў „скрыню з дынамітам і піроксылінам“....**

**Арышты ў Віленшчыне і — „звычаі“ ў мясцовай польскай прэсе.** Апошнія масавыя обыскі і арышты „беларускіх камуністаў“, зробленыя ўладамі бесьпячэнства — у зьвязку з візытам да нас пад-інспэктара дзяржаўнай палітычнай паліцыі п. Снарскага—выклікалі зусім нечаканыя водгукі ў шляхотнай віленскай польскай прэсе.

Перад усім захопленая вынікамі арыштаў частка віленскай польскай прэсы ня вытрымала радасьці і падала заўчасу некалькі прозьвішчаў арыштаваных... За гэта нумары газэты былі канфіскаваны.. Цікава, дый зразумела, што пацярпелі якраз найбліжэйшыя да „незаводных крыніц“ органы польскай прэсы, як „Слова“, дый нават „Дзен. Віл.“... Але ня скончылася і на тым. Карэктны і ляяльны рэдактар „Слова“, абураны ці... шчыра „здаволены“ (як ён піша..) канфіскатай, пайшоў асабіста да п. пракурора Суду, дзе, як піша „Кур. Віл.“, ня столькі „бараніў ад канфіскаты сваю газэту, як... трэбаваў канфіскаваньня яе канкурэнта“—„Кур. Віленскага“... І гэтая газэта сьцьвярджае, што ў выніку „заходу“ да пракурора п. рэдактара „Слова“ ў рэдакцыю „Кур. Віл.“ зьявілася паліцыя, каб канфіскаваць... вышадшы колькі дзен назад „крымінальны“ № газэты, відаць, з тымі-ж весткамі аб арыштах...

Але найцікаўней, што ў запале ўсей гэтай пекнай „палемікі“ між прадстаўнікамі „вышэйшай культуры“ ў Вільні мы даведаліся аб тым, чаго дагэтуль газэты не публікавалі.—А іменна, „Дзеньнік Віл.“ сьцьвярдзіў, што арыштаваны больш як 100 асоб... А „Слова“ вуснамі свайго рэдактара сьцьвярдзіла, што праз некалькі тыдняў перастане выходзіць... Дзякуй і за гэта.

**Чаго прыяжджаў у Вільню „пад-інспэктар палітычнай паліцыі“ п. Снарскі?** У карэспандэнцыі з Вільні да „Robotnika“ пішуць, што „шэф“ палітычнай паліцыі м. Варшавы выслаў да Вільні свайго заступніка—уславўленага пад-інспэктара Снарскага—быццам для рэвізіі ўладаў публічнага бесьпячэнства ўсходніх зямель“... Але чамусьці гэтая камандзіроўка зышлася якраз з прыездам у Вільню... Язэпа Пілсудскага! — „Ці-ж ізноў, піша газэта, маем тут да чыненьня з ганебным сачэньнем (інвігіляцыяй) Пілсудскага“, як гэта было і 2 гады назад, у часе віленскіх публічных лекцыяў Камэнданта, калі таксама быў высланы з Варшавы ў Вільню дзеля таго-ж нейкі п. Плакіда?

Вось гэта дык зусім—„па-рэспубліканску“: высланы з Варшавы п. Снарскі, каб „даглядаць“ за асабліва небясьпечным у гэтыя часы маршалкам Польшчы і тварцом яе!

## Карэспандэнцыі.

### „Сумны абразок“.

(В. Кульгаі, Празар. гм. Дзісн. пав.).

Вялікая нашая вёска і людзей шмат. Аднаго мала—гэта зямлі. Хто мае дзьве-тры дзесяціны—дык гэта ў нас ня то, што „кулак“, а ўжо сам „буржуй“. Заела нас на нішто гэтае беззямельле. І рады няма і ня відаць яе. Пачулі й мы пра нейкую „зямельную рэформу“. Але ўжо наеліся мы гэтых усялякіх „рэформаў“—ажно ўжо горла дзярэ. Дык і ад гэтае рэформы не чакаем зямлі. Ды каля нас няма чаго і „зрэфармаваць“. Двароў вялікіх няма, а тыя, што былі без гаспадароў, дык раздалі ўжо ў „нагароду“ асаднікам—за „przelaną krew“.

Ледзь дачакаліся сёлета жніва, а хто дык доўга й не чакаў—хапаў і недасьпелае, бо галадуха дакучыла. „Буржуі“ нашыя былі з хлебам мо' і да Вялікадня, „кулакі“ да Каляд, а простыя сьмяротныя дык толькі да дзядоў. Ну, і жыцьцё—не дарма людзі просяць сьмерці,—як гэта здарылася ў нашай вёсцы перад жнівам. Калі хавалі адну кабету, дык дарослы мужчына галасіў—прасіў нябожчыцу, каб яна і яго хутчэй забрала да сябе, бо ён ужо ня мае сілы на гэтакае жыцьцё. Чулі на хаўтурах усялякія прыказкі і прычытанкі,—але гэтакіх яшчэ ня чулі. Ды яно нічога й дзіўнага,—бо на што жыцьцё ў пастаяннай нястачы, у беззямельлі, у голадзе, у цемры, — жыцьцё сярод бязліку падаткаў, сярод цкаваньня „хамаў і бандытаў“, сярод дарожных, падводных і ўсялякіх павіннасьцяў?

Затое напэўна ня просяцца ў зямельку тыя, хто разьядаецца на нашым карку. А гэтакіх нямала — у пяць разоў больш, як даўней, а карысьць з іх дзеля нас і дзеля дзяржавы—дык у пяць разоў менш... Як трапіш часам (вядома z „nakazem płatniczym“) хоць у нашае „самаўраднае вясковае староства“, г. ё. у гміну,—дык і ня ведаеш, да каторага стала падыйсьці і да якога „начальніка“ зьвярнуцца. Тутака войт, падвойт, пісар, тры памоцніка, нейкі лаўнік. Здаецца, ужо мінулі тыя часы, што людзей клалі на лаўкі — а лаўнік усё-ж такі застаўся. І ўсе гэтыя „начальнікі“ на пэнсіях—дый не на малых! Селянін і за тры гады таго не заробіць, што адзін з іх за месяц атрымае. І ўсё гэтак добра выпасены,—ажна твары бліщчаць. А яшчэ-ж трэба дадаць стоража, хурманоў, некалькі каней. А конікі ладныя, — асабліва, калі на іх едуць на імяніны, на хрысьціны, у лазьню, часам і проста на спацыр—і вядома-ж, ня мы, сяляне...

**Зязюля.**

### Прапаў чалавек.

(Горадзенскі пав.).

14 верасьня с. г. вучыцель польскае школы вёскі Стрэяўкі, Азерскае гміны, Горадзенскага пав., узяў сабе ў фурманы Стрэяўскага жыхара ехаць да Жыдомлі за сваімі рэчамі. Ен, бачыце, перавазіўся з Жыдамлянскае школы ў Стрэяўскую.

Дарогаю каля вёскі Маштамераў, Жыдамлянскае гм., трэба было пераехаць цераз 3-аршынны ў шырыню мост.

Але з прычыны таго, што мост гэты вельмі стары і небясьпечны,—вучыцель, як кажуць, загадаў фурману ехаць проста цераз раку.

Вада перакінула воз і пакрыла ім фурмана і вучыцеля, у выніку чаго—фурман утануў, а вучыцель, як маладзейшы, выплыў на бераг. Каня выратавалі машталерцы.

Вось і прапаў чалавек за нішто, прападуць яго і дзеткі!

З гэтага няшчаснага фурмана, таксама, як і з усіх другіх, напэўна, спагналі „podatek drogowy“. А ці палепшаны дарогі вясковыя? Не! Дарогі сяляне папраўляюць бяз ніякае платы, а масты за „podatek drogowy“ не папраўляюцца.

Хочам паехаць прыкладам ад Горадні, да Скідля, дык аб'яжджай масты, або рызыкуй на няшчасьце, а ў лепшым выпадку бяры з сабою пару дошчак: пад'ехаў да маста, палажы, пераедзь і зноў улажы ў воз на гэткі самы выпадак... **Салавей.**

## З Радавае Беларусі.

### Польскія школы ў Радавай Беларусі.

„Кур. Віленьскі“ са слоў менскага польскага „Млота“ дае гэткія інфармацыі аб тым, як разьвіваецца польскае школьніцтва ў Радавай Беларусі.

У мінулым годзе на тэрыторыі Усходняй Беларусі было ўсяго 140 школаў, у якіх выкладалася польская мова, у тым ліку 100 чыста польскіх школаў і 40 школ мешаных—польска-беларускіх. У гэтых школах усяго вучылася 9.031 вучань.

Апрача гэтых школ, працавалі яшчэ 64 пункты „ліквідацыі няграматнасьці“. Польскіх „дамоў для дзяцей“ (для зусім малых) — пяць з 243 дзяцьмі; апрача гэтага, 2 фрэблеўскія школы на 80 дзяцей.

Але на гэтым школьныя ўлады БСРР ня спыніліся: апрацавана вельмі шырокая праграма польскай школьнай сеці, якая-б ахапіла ня толькі дзяцей, але й усіх, патрабуючых асьветы. Будуць адчынены 18 школ для дарослых у ўсіх галоўных местах Усх. Беларусі. Апрача таго, вялікшых школаў для моладзі будзе 9—у 9 акружных цэнтрах Б.С.Р.Р.

Так пішуць самі мінскія і віленскія палякі аб школьнай палітыцы радавага ўраду адносна да польскай асьветы.

Ім, здаецца, можна верыць... Але таксама трэба верыць заграніцай таму, што пішуць самы беларусы аб польскай школьнай інквізіцыі ў Заходняй Беларусі.

А трэба-ж яшчэ памятаць, што каранных палякоў у Радавай Беларусі зусім няма, дык тая праца (асабліва сярод сялян) польскай школы граніцыць амаль не з падтрыманьнем палянізацыі спольшчаных абшарнікамі і ксяндзамі беларусаў.

А ў той самы час у нас Польшча не дае роднай нацыянальнай школы 3-мільённаму масіву адвечных каранных жыхараў краю...

Пішыце ў газэту аб усім, што ў Вас дзеецца: аб гмінных парадках, аб адносінах начальства, аб школах і навуцы, дый аб усякіх выпадках у жыцьці Вашае ваколіцы. Пішыце коратка, але поўна і ясна, паказываючы акуратна: што дзе, калі і кім зроблена, прозьвішчы і адрасы пакрыўджаных і крыўдзіцеляў. Канешне падпісывайце і сваё імя— толькі для ведама рэдакцыі!

Рэдактар-Выдавец: Ул. Варавва.

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.